ПРАЕКТ «ЛЮБАНШЧЫНА ПАРТЫЗАНСКАЯ»

# Не скарыліся чужаземцам

**У лютым-сакавіку 1943 года гітлераўцы, не дабіўшыся значных поспехаў у барацьбе з партызанамі ў час карнай аперацыі пад кодавай назвай «Русалка», надзвычай жорстка абышліся з мірным насельніцтвам.**

На Любаншчыне поўнасцю былі спалены вёскі Дворышча (загінула 9 мясцовых жыхароў), Вялікія Гарадзяцічы (13), Малыя Гарадзяцічы (18), Прыклінец (4) і Гуляева (1). Часткова фашысты знішчылі агнём вёскі Жывунь, Кузьмічы, Абоз. І там карнікі забілі нямала нашых землякоў. Аднак ні скарыць, ні запужаць насельніцтва раёна сваімі крывавымі здзекамі гітлераўцам не ўдалося. Наадварот, гэта выклікала магутную хвалю супраціўлення захопнікам, прывяло да росту шэрагаў народных мсціўцаў.

**У сакавіку 1943 года партызанская брыгада №25 імя Панцеляймона Панамарэнкі прыняла ў свой склад новы атрад імя Кастуся Каліноўскага з жыхароў вёсак Кузьмічы і Серадзібар.**

У дакументах пішуць, што гэты атрад стварылі на базе ініцыятыўнай групы **Івана Хімічова**. Ветэраны ж прыгадвалі тую падзею крыху інакш: маўляў, мясцовыя жыхары, якіх гітлераўцы дапяклі да крайнасці, самі звярнуліся да начальства брыгады: у нас мноства тых, хто хоча змагацца з акупантамі, і зброя маецца ледзь не ў кожнага, дык дайце нам талковых камандзіраў.

Іван Аляксеевіч Хімічоў такім і з'яўляўся. Па-першае, ён быў вопытным кадравым вайскоўцам, у 1939 г. удзельнічаў у вызваленчым паходзе ў Заходнюю Беларусь, у 1940 г. – у савецка-фінскай вайне. Займаў пасаду начальніка ваенна-тэхнічнага забеспячэння 204-й авіябазы. Апынуўшыся на акупаванай тэрыторыі, з ліпеня 1941 г. кіраваў падпольнай групай у Бабруйску, быў памочнікам камандзіра ў партызанскім атрадзе М. Храпко, начальнікам штаба атрада К. Дзяшковіча.

Атрад размяшчаўся ва ўрочышчы Опін – на базе былой будаўнічай арганізацыі «Арэскі калфонд». Тут тыя, хто не трымаў у руках зброі, праходзілі курс маладога чырвонаармейца. Юнакоў вучылі не толькі трапна страляць, але і падрыўной справе, тактыцы партызанскіх дзеянняў. А ўжо потым байцоў адпраўлялі на заданні – то ў дазор, то ў засады, то на дыверсіі на нямецкіх чыгуначных камунікацыях.

Пра баявую работу «каліноўцаў» даволі часта згадваецца ў дзённіку камандзіра брыгады №25 Аляксандра Далідовіча. Так, напрыклад, у 1943 годзе ён пісаў: «9 мая, нядзеля. У перыяд з 6 па 9 мая атрад Хімічова зрабіў трынаццаць узрываў на стыках рэек. Парвана дванаццаць рэек агульнай даўжынёй 144 метры... 8 лістапада, панядзелак. На дарозе Урэчча–Таль падрыўнікі атрада Хімічова знішчылі трохтонную аўтамашыну. Забіты тры немцы. 9 лістапада, аўторак. Пры зняцці замініраванага чырвонага сцяга, які вывесілі на станцыі Брынёва партызаны атрада Хімічова, забіты два салдаты праціўніка і адзін кантужаны».

А вось яшчэ запісы: «З 15 па 18 лістапада брыгадай праведзена аперацыя па разбурэнні дарог. На дарозе Урэчча-Таль партызаны атрада Хімічова паставілі міны, на якіх загінулі пяць «фрыцаў», у тым ліку адзін афіцэр. 2 снежня, чацвер. Байцы атрада Хімічова пад камандаваннем начальніка штаба **Сямёна Нагорнага** на грунтовай дарозе Бялёў–Жыткавічы на мінах падарвалі дзве аўтамашыны, забіты 43 немцы. Была падарвана таксама легкавая аўтамашына, у якой загінулі тры афіцэры і салдат-шафёр. Гэтай жа групай на станцыі Старушка пад паравоз была закладзена магнітная міна. У выніку паравоз узарваны, загінуў машыніст».

**«Каліноўцы» вясной–летам 1943 г. актыўна ўдзельнічалі ў аперацыі «Граніт» па разбурэнні транспартных ліній гітлераўцаў. А пасля ў аперацыях «Рэйкавая вайна» і «Канцэрт», што праводзіліся летам і восенню.**



Іван Аляксеевіч ХІМІЧОЎ.



Сямён Міхайлавіч НАГОРНЫ.



Фёдар Ціханавіч ДУДЗІК.



Якім Аляксеевіч МІХАЛЕНЯ.



Міхаіл Аляксеевіч ТРАСКУНОЎ.



Іван Паўлавіч БАРЫСЕВІЧ.



Рыгор Мікалаевіч РУСАКОВІЧ.

Акрамя таго, атрад граміў варожыя гарнізоны, мужна змагаўся з захопнікамі, калі тыя атакавалі партызанскую зону. Напрыклад, з 31 студзеня па 7 лютага 1944 года «каліноўцы» стойка стрымлівалі націск фашыстаў у баях за вёску Старыя Юрковічы, калгас імя БВА і мост у раёне хутара Хварашчова. У выніку атрад знішчыў 63 нямецкія салдаты і афіцэры, падбіў танк праціўніка і ўзарваў згаданы мост.

Многія з падначаленых Івана Хімічова (а за год існавання колькасць байцоў у атрадзе імя Кастуся Каліноўскага перавaліла за 240 чалавек) за смеласць і адвагу былі прадстаўлены да высокіх урадавых узнагарод. Скажам, жыхароў вёскі Кузьмічы камандзіра аддзялення разведкі Івана Прыступчыка і кулямётчыка **Фёдара Дудзіка** прадставілі да медаля «Партызану Айчыннай вайны» I ступені, камандзіра аддзялення станковых кулямётаў **Якіма Міхаленю**, разведчыка Міхася Лучыновіча і байца Фёдара Лучыновіча – да медаля «Партызану Айчыннай вайны» II ступені.

Камандзір аддзялення атрада Мікалай Семяновіч з вёскі Вялікія Гарадзяцічы быў узнагароджаны медалём «За баявыя заслугі». У прадстаўленні да ўзнагароджання яго ордэнам Чырвонай Зоркі камандзір атрада адзначаў, што Мікалай Семяновіч «ва ўсіх баях атрада ўмела кіраваў аддзяленнем, на рахунку якога маецца 42 забітыя і параненыя немцы».

Высока ацаніла Радзіма і камандзірскі талент самога Івана Хімічова: яго кіцель упрыгожылі ордэны Чырвонай Зоркі і Айчыннай вайны II ступені, медаль «Партызану Айчыннай вайны» I ступені, іншыя ўзнагароды.

У сакавіку 1943 года ў складзе Мінскага партызанскага злучэння была створана і новая партызанская брыгада – №100 імя С.М. Кірава. Яе ўзначаліў Аляксей Шуба, камісарам стаў Георгій Машкоў, а начальнікам штаба – Фёдар Дзераўнін. У брыгаду ўвайшлі адразу тры новыя атрады – №1 імя В.І. Чапаева, №2 імя М.І. Кутузава і №3 імя М.В. Фрунзе, якія таксама былі арганізаваны ў сакавіку 1943-га.

Месцам дыслакацыі штаба брыгады доўгі час была вёска Асавец.

Варта адзначыць, што ў тых першых атрадах знаходзілася нямала ўраджэнцаў Любаншчыны. Так, атрад №1 імя В.І. Чапаева ледзь не на трэць складаўся з жыхароў вёсак Зялёнкі, Пеклічы, Чабусы, Забалаць, Асавец, Касцяшы. Камандзірам атрада быў Ісаак Жукавец.

**Ваявалі «чапаеўцы» добра. На іх баявым рахунку разгром нямецка-паліцэйскіх гарнізонаў у Сінягове, Макарычах, Макавічах, Фалічах, Дражне, спуск пад адхон чатырох варожых эшалонаў з жывой сілай і тэхнікай, паўсотні знішчаных гітлераўскіх аўтамашын, некалькі разбураных мастоў на камунікацыях акупантаў, больш за 450 забітых салдатаў і афіцэраў праціўніка. Атрад прымаў актыўны ўдзел у баях па абароне вёсак Чабусы, Пасека, Глядавічы.**

Дарэчы, вось што наконт апошняга ўспамінаў камісар партызанскага атрада №3 імя М.В. Фрунзе **Міхаіл Траскуноў**: «19 жніўня 1943 года каля пяцісот гітлераўцаў з гарнізона Старых Дарог, узброеных гарматамі, ротнымі мінамётамі, аўтаматамі, уварваліся ў вёску Будзенічы, каб забраць зерне і хатнюю жывёлу ў сялян. Фашысты прывезлі з сабой малацілку з трактарам і, арганізаваўшы кругавую абарону, пачалі абмалот хлеба. На другі дзень праціўнік паспрабаваў праз вёску Крываносы прайсці ў вёску Глядавічы, каб і там пажывіцца пладамі сялянскай працы. Але, сустрэўшы арганізаваную абарону атрадаў 100-й брыгады, пасля чатырохгадзіннага бою адкаціўся назад у Будзенічы. Народным мсціўцам паставілі задачу не даць акупантам вывезці хлеб у Старыя Дарогі. Партызаны замініравалі шашу і выставілі засады. Некалькі падвод і дзве аўтамашыны, а разам з імі каля двух дзясяткаў гітлераўцаў былі знішчаны».

Не хаваліся за чужымі спінамі і «чапаеўцы»– ураджэнцы любанскіх вёсак. Многія з іх пакрылі сябе неўміручай славай. Сярод іх Антон Рубчэня з Зялёнак, яго аднавясковец Павел Клютчэня (быў прадстаўлены да ордэна Чырвонай Зоркі), Мікалай Гальчэня і **Іван Барысевіч** з Пеклічаў (другі загінуў 2 кастрычніка 1943 г. каля в. Ст. Юрковічы, пахаваны ў брацкай магіле на востраве Зыслаў), Антон Бірыла, Антон Жэчка, Міхаіл Кандраценя і Пётр Кругленя з Чабусаў, Апанас Даўгучыц з Касцяшоў, асавецкія хлопцы Віктар Станкевіч, **Рыгор Русаковіч** і шэраг іншых.

Сакавік 1943 года ад вызвалення нашай зямлі ад захопнікаў аддзялялі доўгія вёрсты вайны. Вёрсты, напоўненыя неймавернымі пакутамі нашага народа, адчайнай барацьбой з ворагам, прыкладамі высокага гераізму, велічнымі подзвігамі. Давайце памятаць пра гэта!

**Сяргей КВІТКЕВІЧ, навуковы супрацоўнік Любанскага музея народнай славы.**